# ФЛАРЫСТЫЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ТВОРЧАСЦІ А. РАЗАНАВА

Д. В. МЯДЗВЕЦКАЯ

*УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», Брэст, Беларусь, borsnina@yandex.by*
*Навуковы кіраўнік – Н. М. Борсук, заг. кафедры, к.ф.н.*

**Уводзіны.** Паэзія Алеся Разанава дастаткова няпростая для ўспрымання чытачом. Яна насычана лексемамі, звязанымі з раслінным светам. Фларыстычная вобразы дапамагаюць паэту зрабіць тэкст эмацыйным, вобразным, а прыродныя рэчы бачнымі, канкрэтнымі. Найменні дзікарослых і пладовых дрэў (бяроза, вярба, вішня, яблыня, сасна і г.д.) – паказчык філасафізму паэта, сродак самавыяўлення творчай асобы. І гэта невыпадкова. Вытокі творчасці А. Разанаў чэрпаў ад шчырай беларускай народнай песні, спеўнага пошуму лясоў, рэк. Больш таго, дзяцінства і юнацтва А. Разанава прайшло сярод вясковага ўлоння, на Бярозаўшчыне, што, безумоўна, уплывала на фарміраванне адчування духоўнай злітнасці з прыродай.

**Матэрыялы і метады.** Паэтычныя зборнікі А. Разанава, аналітычны метад.

**Вынікі і абмеркаванне.** Героем шматлікіх твораў беларускіх паэтаў з'яўляецца вобраз бярозы. А. Разанаў суадносіць гэтае дрэва з вобразам жанчыны, прыгожай, светлай, якая валодае жыццядайнай сілай, корміць, лечыць, зачароўвае... Адначасова для паэта бяроза – своеасаблівы медыятар паміж тым і іншым светам (верш “Адгарадзіўся ад наваколья”). На эквівалентнасць адносін да жанчыны і бярозы ўказвалі фалькларысты, у прыватнасці, І. Швед.

У дачыненні да вярбы ў міфалогіі і фалькloры назіраецца падвоенасць у залежнасці ад узросту дрэва: маладое – свяшчэннае, старое звязана з нячыстай сілай. Вярба ў А. Разанава сімвалізуе жыццё, абуджэнне ўсяго жывога (верш “Вецце спусьціла ў замерлы ставок”).

Праз вобраз яблыні А. Разанаў выразна акрэсліў адзін з варыянтаў Дрэва жыцця: жыццё – несмяротнасць, маладосць – старасць: “Дзе – старасьць, / дзе – маладосьць?! / Зацьвілі яблыні сёньня”.

Вобраз вішні, якая сімвалізуе дзяўчыну, гатовую да ўступлення ў шлюб, трактуецца паэтам у кантэксце песень на шлюбна-любоўную тэматыку: “Вішня наўскрай дарогі, / спяшайся першаю расцвісць – / у пчол абранніцай будзеш”.

У якасці сімвалаў цярпення і пакут прадстаюць са старонак паэтычных кніг А. Разанава вобразы каліны, асіны, рабіны: “Гронкі рабіны / зачырванелі: / ўгару горнецца позірк”.

**Заключэнне.** Як бачна, шматлікія батанічныя номены выступаюць у творчасці паэта як сродкі, пры дапамозе якіх паэт імкнецца навучыць чалавека бачыць нябачнае, адчуваць прыроду. Жанр пункціры, абраны А. Разанавым, дапамагае мастаку слова спасцігнуць цэлае праз разгадку сэнсу яго складнікаў, частак. Матэрыял можа быць выкарыстаны пры стварэнні батанічных тэрміналагічных слоўнікаў, пры распрацоўцы этнакультурных турыстычных маршрутаў па родным краі.